# TIME (Marek Szurpik), Palubiła piwaka (Pokocha

Пасадзіла ружу край акна (2х)
Палюбіла мужа (3х) півака

Нічога не робіць - водку п'е (2х)
Як прыйдзе дадому, (3х) жонку б'е

Не бі мяне, мужу, не карай, (2х)
Бо я цябе кіну, яшчэ і малу дзіціну,
А сама паеду ў чужы край

Ой, вярніся, жонка, дадому (2х)
Я не буду піці, яшчэ і буду любіці,
Бо мне ў жыцці цяжка аднаму

Ой, прыходзіць жонка дадому, (2х)
А лыжкі немыты, а міскі пабіты,
А галодныя дзеці ў кутку

Абарвала ружу ля акна, (2х)
Паўмывала лыжкі, пазбірала шчэпкі,
То і пайшла упрочкі край сяла

Выйшла на гасцінец край сяла (2х)
Што будзе з дзяцінай? (2х)
Прападзе з-за мужа півака

Кінула ружу на шляху, (2х)
Памалілась Богу, (2х)
То і вярнулась ночкай дадому

На парозе п'яны муж стаіць, (2х)
А дзіця малое, ўжо як нежывое,
Ў кутку на кортачках сядзіць

Пасадзіла ружу край акна (2х)
Палюбіла мужа (3х) півака